# Фотавыстава ў бібліятэцы

***Бібліятэка Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта першай у Беларусі дала магчымасць азнаёміцца з найлепшымі работамі міжнароднага фотасалона "Планета дзяцей", арганізаванага Нацыянальным саюзам фотамастакоў Украіны і міжнародным фатаграфічным рухам "Вобраз без меж" ISF — Image sans Frontiere. Гэтым праектам, а таксама размеркаванай галерэяй "Фотамастацтва", бібліятэка БДТУ адкрывае сезон фотавыстаў 2019 года.***

Магчыма, вы чулі размовы пра прафесіі, якія ў будучыні знікнуць. Сярод іх называюць і прафесію бібліятэкара. Але тут мы гатовы паспрачацца і пазнаёміць вас з бібліятэкай адной са старэйшых УВА — Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта. Немагчыма ўявіць вышэйшую адукацыю, эфектыўную навуку без інфармацыйнай і вучэбна-метадычнай падтрымкі сучаснай універсітэцкай бібліятэкі, якой і з'яўляецца бібліятэка БДТУ. Дастаткова адзначыць, што створаная супрацоўнікамі электронная бібліятэка, якая змяшчае больш за 14 тысяч паўнатэкставых дакументаў, у рэйтынгу рэпазіторыяў адкрытага доступу Webometrics — Ranking web of repositories у студзені 2019 года ўвайшла ў тысячу лепшых рэпазіторыяў свету і знаходзіцца на 316-м месцы. У Беларусі гэта 3-е месца сярод рэпазіторыяў УВА.

Акрамя асноўнай задачы — забеспячэння вучэбнага працэсу падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі, бібліятэка ставіць перад сабой мэту эстэтычнага выхавання студэнтаў, стварэння ўтульнай атмасферы, якая схіляе да работы.

Ідэя праекта, размешчанага ў чытальнай зале, заключаецца ў тым, каб паказаць, чым жывуць сёння нашы дзеці, і праз работы лепшых фотамастакоў прыцягнуць увагу грамадскасці і ўрадаў свету да праблем дзіцяці. Фотавыстава нікога не можа пакінуць абыякавым. Гледзячы на здымкі, на дзіцячыя твары, якія ззяюць непасрэднасцю і запалам, бесклапотнасцю і гарэзлівасцю, згадваеш, як сам з хваляваннем, захоплена сустракаў кожнага матылька, радаваўся першай кветцы, што распусцілася, і з зачараваннем гуляў у снезе... Гэтыя маленькія чалавечкі сапраўды жыхары іншай планеты. Планеты, поўнай сонечных зайчыкаў, іскрынак смеху, россыпу вяснушак і непаслухмяных кучараў, плям на любімых штоніках, прамянёў вясенняга сонца, залівістых спеваў птушак.

А ў самых цёмных закавулках, на ўскраінах, задворках гэтага свету ёсць іншая рэальнасць, якая палохае, парушае веру ў справядлівасць, знішчае ўсведамленнем таго, што ўсё гэта існуе побач з табой, а ты бяссільны. Жыхарам гэтай часткі планеты знаёмы голад, галеча, страшныя хваробы, увесь жах існавання ў адзіноце, сам-насам са сваімі нягодамі. Неспасціжна, якую сілу духу мае кожны з іх, з якой упартасцю змагаюцца яны за існаванне!

Выстава атрымалася па-сапраўднаму сумленнай, яна кранае за жывое, уражвае тым, што, здавалася б, кардынальна розныя жыцці, гісторыі — часткі адзінага цэлага.

Зайшоўшы ў бібліятэку, трапляеш яшчэ на адну фотавыставу. Гэты раз — беларускага фатографа Канстанціна Мельніка, арганізатара размеркаванай галерэі "Фотамастацтва". Яго работы прасякнуты любоўю да ўкраінскай зямлі, гісторыі, людзей. Разглядаеш здымкі... і быццам апынаешся там: адчуваеш пах марознага сонечнага дня, жмурышся на іскрыстыя сняжынкі, адчуваеш пад пальцамі шурпаты бок млына і ціхенькае парыпванне лопасцей... Удыхаеш глыбей, разбягаешся і цягнеш адну з пушыстых яловых галін. Цябе аблівае хваляй снегу, ён забіваецца за каўнер, асядае на вейках, смешна казыча нос... І нясцерпна хочацца туды, у Пірагова — Музей народнай архітэктуры і побыту Украіны. Палюбавацца старажытнымі хатамі, мудрымі елкамі, ячнымі снапкамі для вераб'ёў, пасядзець за сталом гасцінных гаспадароў і абавязкова пакаштаваць пампушак з мукі, змолатай чараўніком-млынаром...

"Адной з мэт сваёй работы стаўлю стварэнне ў бібліятэцы атмасферы дружалюбных адносін да чытачоў, каб нашым студэнтам і выкладчыкам хацелася прыйсці да нас не толькі па кнігі, але і па сяброўскія зносіны. Правядзенне фотавыстаў сумесна з нашымі сябрамі — размеркаванай галерэяй "Фотамастацтва" — адзін са спосабаў зрабіць прастору бібліятэкі душэўнай і ўтульнай, — расказвае Святлана Знайдзюк, дырэктар бібліятэкі. — Фотагалерэя прываблівае нашых чытачоў, якія цікавяцца, што яшчэ плануем выстаўляць. Значыць, мы працуем недарэмна! Многа і планаў: гэта і правядзенне студэнцкага фотаконкурсу пра родныя месцы, сустрэчы з лепшымі і таленавітымі фотамастакамі Беларусі. І, дарэчы, запрашаем да ўдзелу ў X Міжнародным фотаконкурсе пры падтрымцы Беларускага дзіцячага фонду "4383 дні дзяцінства". Наша фотагалерэя адкрыта для гледачоў. Будзем рады сустрэчы!"

**Хрысціна КАЗАЧЭНКА.**